**Самайлюк Т.А.,** *заг.аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі Беларускага універсітэта культуры,*
**Доўнар Л.І.,** *суіскальнік*

# ПРАБЛЕМЫ НЕДЗЯРЖАЎНАЙ ВЫДАВЕЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА БЕЛАРУСІ

Адным з фактараў развіцця новага грамадства з'яўляецца нармальнае функцыяніраванне ў ім выдавецкай дзейнасці. У Беларусі на фоне агульнага крызісу эканомікі адбываецца спад у выдавецкай сферы. Адсутнасць прадуманай дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне адмоўна ўплывае на фарміраванне кніжнага рынку рэспублікі. Дзяржава практычна перастала клапаціцца аб тых выданнях, якія ва ўсім свеце карыстаюцца дзяржаўнай падтрымкай ці спонсарскай дапамогай. Скарачэнне выдавецкай прадукцыі - шлях да інтэлектуальна-духоўнай катастрофы нацыі, дапусціць якую мы не маем права. Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць валодае патэнцыяльнай сілай, каб змяніць існуючую сітуацыю. Таму патрэбна звярнуць увагу прадстаўнікоў недзяржаўных выдавецтваў на неабходнасць выпуску літаратуры, якая садзейнічала б нацыянальнаму адраджэнню беларускага народа, развіццю навукі, тэхнікі, адукацыі і г.д.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Поўная адсутнасць нарматыўна-заканадаўчай базы («Закон аб абавязковым экземпляры дакументаў» і інш.), якая павінна рэгуляваць узаемаадносіны паміж недзяржаўнымі выдавецтвамі і бібліятэкамі, недасканаласць уліку друкаванай прадукцыі камерцыйных выдавецтваў, адсутнасць сістэмы інфармавання бібліятэк аб плануемых да выпуску кнігах адмоўна ўплываюць на камплектаванне бібліятэчных фондаў і ўвогуле на распаўсюджванне літаратуры. Нават Нацыянальная бібліятэка і іншыя буйныя бібліятэкі рэспублікі не атрымліваюць у складзе кантрольнага экземпляра друкаваную прадукцыю шэрага камерцыйных выдавецтваў.

Праблему неабходна разглядаць не толькі з улікам адсутнасці спрыяльнай дзяржаўнай палітыкі ў кнігавыдавецкай дзейнасці і спаду кніжнай вытворчасці, але і ў гісторыка-тэарэтычным, педагагічным і сацыяльна-эканамічным аспектах.

Мінулы вопыт прыватнай выдавецкай дзейнасці страчаны. З пункту гледжання назнання новых з'яў сучаснай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі на Беларусі недзяржаўная выдавецкая практыка патрабуе асэнсавання як з'ява гісторыка-культуралагічная. Неабходна вывучэнне гісторыі, абагульненне вопыту, выяўленне тэндэнцый, заканамернасцей, нацыянальных традыцый недзяржаўнай выдавецкай дзейнасці, а таксама магчымых шляхоў выкарыстання гэтых традыцый і вопыту.

У вучэбна-педагагічнай практыцы неабходна вывучэнне гістарычных і сучасных цэнтраў выдання, спосабаў фарміравання дакументальных патокаў, метадаў іх размер-кавання, пераразмеркавання і інфармавання аб іх.

Сучасная сацыяльна-эканамічная практыка патрабуе комплекснага вывучэння адносін дзяржавы і недзяржаўных выдавецтваў, бібліятэк і недзяржаўных выдавецтваў, бібліятэк і кнігагандлёвых устаноў, уздзеяння гэтых структур на ўмовы фарміравання, размеркавання і пераразмеркавання даку-ментальных патокаў, інфармавання аб іх.

Удасканаленне інфармацыйнай інфраструктуры грамадства прадугледжвае яе пашырэнне і далейшае развіццё;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наладжванне кантактаў паміж недзяржаўнымі выдавецкімі ўстановамі, бібліятэчнымі і кнігагандлёвымі структурамі ў галіне камплектавання і распаўсюджвання выдавецкай прадукцыі, выяўленне новых форм абслугоўвання чытачоў. У галіне гэтай дзейнасці адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Недзяржаўная выдавецкая дзейнасць у Беларусі: гісторыя і сучаснасць», якую арганізавалі ФБІС, аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі Беларускага універсітэта культуры і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя 5-6 ве-расня 1996 года.

Асноўная ідэя канферэнцыі - сабраць навукоўцаў Беларусі і замежных краін, прадстаўнікоў міністэрстваў і ведамстваў Рэспублікі Беларусь, прадпрымальнікаў, дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, журналістаў, кіраўнікоў вядучых недзяржаўных выдавецкіх установ, супрацоўнікаў бібліятэк, Нацыянальнай кніжнай палаты, кнігагандлёвых дзяржаўных і недзяржаўных цэнтраў і абмеркаваць агуль-ныя пытанні іх узаемадзеяння; разгледзець гісторыю і сучаснае становішча прыватнай выдавецкай дзейнасці на Беларусі і беларускай дыяспары за мяжой; звярнуць увагу грамадскасці на складанае становішча сучаснага існавання выдавецкай справы ў рэспубліцы, актуальнасць стварэння нарматыўна-заканадаўчай базы рэгулявання ўзаемаадносін паміж недзяржаўнымі выдавецтвамі і бібліятэчна-інфармацыйнымі структурамі.

Канферэнцыя дазволіла вызначыць прыярытэтныя напрамкі недзяржаўнай выдавецкай дзейнасці ў галіне адраджэння культурнай спадчыны Беларусі, развіцця нацыянальнай навукі, культуры і адукацыі; падрыхтаваць прапановы па распрацоўцы нарматыўна-прававой дакументацыі (напрыклад, «Закон аб абавязковым экзем-пляры дакументаў»); надрукаваць матэрыялы канферэнцыі, якія паслужаць крыніцай вывучэння гісторыі і сучаснага стану недзяржаўнай выдавецкай дзейнасці на Беларусі; распрацаваць новыя і ўдасканаліць існуючыя праграмы ў галіне падрыхтоўкі бібліятэкараў, бібліёграфаў, журналістаў, работнікаў музеяў, кніжнага гандлю, кнігазнаўцаў, менеджэраў інфармацыйнай дзейнасці і г.д.